Аддзел абслугоўвання і інфармацыі ЦБ

# Іван Паўлавіч Мележ

## «Ад паэзіі сэрца да прозы жыцця»



**Да 105-гадовага юбілею народнага пісьменніка Беларусі**

**(1921-1976)**




Іван Паўлавіч Мележ нарадзіўся 8 лютага 1921 г. у вёсцы Глінішча Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сямігодкі вучыўся ў сярэдняй школе № 1 у Хойніках, якую скончыў у 1938 г. Працаваў у Хойніцкім райкаме камсамола. У 1939 г. паступіў у Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры. З першага курса быў прызваны ў Чырвоную Армію, служыў у 289-м палку 192-й горна-артылерыйскай дывізіі (тэрыторыя Украінскай ССР). Летам 1940 г. удзельнічаў у ваенным паходзе ў Паўночную Букавіну і Бесарабіі. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце — на Збручы, пад Уманню, Нікалаевам, Сінелькавам, Лазавой, Растовам-на-Доне. У снежні 1941 г. быў паранены. У лютым — маі 1942 г. займаўся на курсах палітсаставу Паўднёвага фронту (г. Каменск), пасля якіх працаваў літсупрацоўнікам газеты 51-й стралковай дывізіі «Красноармейская правда». 20 чэрвеня 1942 года пад Растовам быў цяжка паранены. Лячыўся ў шпіталях Растова, Есентукоў, Тбілісі.

Потым жыў у Бугуруслане, выкладаў ваенную падрыхтоўку і завочна вучыўся ў Малдаўскім педагагічным інстытуце. У 1943 г. пераехаў на станцыю Сходня ў Падмаскоўі, дзе аднавіў працу Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. У 1943—1944 гг. выкладаў ваенную справу ў БДУ. У 1944 г. разам з універсітэтам пераехаў у Мінск. Адначасова завочна вучыўся на філалагічным факультэце БДУ, затым перайшоў на стацыянар (скончыў навучанне ва ўніверсітэце ў 1945 г.). У 1945—1948 гг. вучыўся ў аспірантуры пры БДУ. З мая 1945 г. па студзень 1947 г. адначасова працаваў у рэдакцыі часопіса «Полымя». У 1948—1950 гг. — старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры БДУ. Са жніўня 1950 г. па верасень 1951 г. працаваў у апараце ЦК КП(б)Б. З 1966 г. — сакратар, у 1971—1974 гг. — намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.





Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР 7-га і 8-га скліканняў (1967—1976). Быў старшынёй праўлення Беларускага аддзялення таварыства «СССР — Францыя», старшынёй Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру, членам Сусветнага Савета Міру (1970). Памёр 9 жніўня 1976 г., пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.





***І. П. Мележ з жонкай Лідзіяй Якаўлеўнай і дачкой Людай***

У 1939 г. надрукаваны першы верш «Радзіме» ў газеце «Чырвоная змена». Першае выступленне ў друку як празаіка адносіцца да 1943 г.: газета «Бугурусланская правда» апублікавала апавяданне на рускай мове «Последняя операция». 25 лістапада 1944 г. газета «Звязда» надрукавала апавяданне на беларускай мове «Сустрэча ў шпіталі». Выдаў зборнікі аповесцей і апавяданняў «У завіруху» (1946), «Гарачы жнівень» (1948), «Блізкае і далёкае» (1954), «У гарах дажджы» (1957), «Што ён за чалавек» (1961), «Белыя вішні і яблыні» (1976). Аўтар рамана «Мінскі напрамак» (1947 — 1952, дапрац. выд. — 1974). Стварыў цыкл раманаў «Палеская хроніка»: «Людзі на балоце» (1962), «Подых навальніцы» (1966) і «Завеі, снежань» (1976). Аўтар п’есы «Пакуль вы маладыя» (1956), «Дні нашага нараджэння» (1958), аднаактоўка «Хто прыйшоў уночы» (1959).





Сустрэча на дачы ў Міхася Лынькова.
Іван Шамякін, Іван Мележ,
П. М. Машэраў, Міхась Лынькоў.
*18 чэрвеня 1972 г.*

# Літаратурная дзейнасць

З канца 1947 г. Іван Мележ працуе над раманам «Мінскі напрамак» (1947-1953).

Аўтар расказвае пра вызваленчую барацьбу на Беларусі летам 1944 года, пра аперацыю «Баграціён».

***Іван Паўлавіч прызнаваўся, што кніга памятная яму і таму, што «толькі з яе выхадам адчуў сябе пісьменнікам».***



***Доўгі час пасля выхаду "Мінскага напрамку" Мележ піша апавяданні, невялікія аповесці і п'есы.***



# *Літаратурная дзейнасць*










***1946*** *– зб. апавяданняў «У завіруху»*

***1952*** *– раман «Мінскі напрамак»*

***1954*** *– зб. «Блізкае і далёкае»*

***1957*** *– зб. «У гарах дажджы»*

***1961*** *– зб. «Што ён за чалавек»*

***1962*** *– раман «Людзі на балоце»*

***1965*** *– раман «Подых навальніцы»*

***1976*** *– раман «Завеі, снежань»*

*Незавершаны «За асакою бераг», «Праўда вясны»*

# «Палеская хроніка»

Іван Мележ — аўтар цыкла раманаў «Палеская хроніка»:




- ***«Людзі на балоце» (1962)***
- ***«Подых навальніцы» (1966)***
- ***«Завеі, снежань» (1976)***

***«Ведаць, хто мы. Не забываць, адкуль мы выйшлі. Толькі тады, калі мы будзем ведаць, адкуль мы, якімі былі, мы можам ведаць, хто мы. Ведаць цану сабе, свайму жыццю»***

***І. Мележ***

*Янка Брыль настолькі быў захоплены і ўражаны раманам Івана Мележа «Людзі на балоце», што вырашыў кінуць працу ў выдавецтве і стаць вольным літаратарам, каб нішто яму не замінала завяршыць свой раман «Птушкі і гнёзды».*



*Раман «Людзі на балоце» перакладзены на шмат якія мовы, а самім раманам Мележ зрабіў вялікі і каштоўны мастацкі ўнёсак у нацыянальную беларускую літаратуру.*







Сцэна са спектакля «Людзі на балоце». Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы (2012)

***Беларускім тэлебачаннем пастаўлены спектакль "Людзі на балоце" (1965), тэлепастаноўка «Сустрэчы і развітання» (тэлефільм «Завеі, снежань», 1979), «Страсці эпохі» (паводле рамана «Завеі, снежань», 1989) У 1981 годзе рэжысёр Віктар Тураў на студыі "Беларусьфільм" зняў 8-мі серыйную карціну па першых двух раманах хронікі. Жыццю і творчасці пісьменніка прысвечаны дакументальны фільм "Іван Мележ" (сцэнарый В. Адамчыка, 1978) і відэафільм "Лёс і кнігі Івана Мележа".***











***Івану Паўлавічу Мележу***

***ў 1972 г. прысуджана званне***

***Народнага пісьменніка Беларусі.***



**_Памёр Іван Паўлавіч Мележ_**
**_у жніўні 1976 года ва узросце 55 год._**



# *Узнагароды*

Два ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга (28.10.1967; 05.02.1971);
Ордэн Чырвонай Зоркі (06.08.1946);
Ордэн "Знак Пашаны" (25.02.1955);
Медалямі;
Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1962) за раман "Людзі на балоце";
Ленінская прэмія (1972) за раманы "Людзі на балоце" і "Подых навальніцы";
Дзяржаўная прэмія БССР (1976) за кнігу крытычных нарысаў, артыкулаў "Жыццёвыя клопаты" (пасмяротна).
За вялікія дасягненні ў развіцці беларускай літаратуры ў 1972 годзе І.П. Мележу прысвоена ганаровае званне народнага пісьменніка Беларусі.

# Ушанаванне памяці

У 1980 годзе Саюзам пісьменнікаў Беларускай ССР была заснаваная літаратурная прэмія імя Івана Мележа;
У Мінску, Хойніках, Лельчыцах, Гомелі названая вуліца ў гонар Івана Паўлавіча Мележа;
У Мінску на доме № 7 па вуліцы Я. Купалы, дзе жыў пісьменнік, устаноўлена мемарыяльная дошка (1978);
У Гомелі імем пісьменніка названыя беларуска-славянская Гімназія № 36 і гарадская бібліятэка № 2;
У 1983 годзе на радзіме І.П. Мележа ў вёсцы Глінішча адкрыты мемарыяльны музей і ўсталяваны бюст;
У Хойніках у 2010 годзе адкрыта скульптурная кампазіцыя "Па старонках твораў Івана Мележа";
Імя Івана Мележа носіць Мазырскі драматычны тэатр.













І.П. Мележ. [1950-я гг.]



Раннія вершы (1938-1941)
Іван Мележ
4

Радзіма

Усё табе – прыгожай і багатай –
Сілуэты самалётаў баявых,
Дужасць караблёў Кранштата,
Берагі гранітныя Нявы,

У далячынь прапеглыя дарогі,
Спелыя жытнёвыя палі –
І яшчэ – не пералічыш – многа,
Што табе навек мы аддалі.

У тваіх, [illegible], прасторах –
[illegible] некаўдомі краса –
Гарманісты песні табе дораць,
Песні на найлепшых галасах.

Ты пачуй – у песнях тых пнецца,
Што ў Нязах, у морах і ў баю
Для цябе, аддадзеныя ўсім сэрцам,
Маладосць гартуем мы сваю.

Не дарэмна кожны год увосень
З сцягамі па вуліцы ідзём –
Мы сыноўнія кветкі праносім
Імя найдарожшае тваё!

Мы клянёмся –
За жыццё вясёлых,
[illegible] гарадоў,
За вясенні вецер, што па сёлах
Вольна дваццаць першы раз прайшоў,

За нязгасны зорак Крамлёўскіх зораў
Над палямі роднымі – усё:
Сэрцы, мужнасць, дум сваіх прасторы –
Толькі клікні – смела прынясём!

1938-39 г.
/Надрук. "Чырв.зм." 20.2.39г/
першы надрукаваны верш

13

"У АПОШНІ ЧАС"

За акном завіруха мяце.
Месяц ў хмарах белых згас.
Дзень у клопатах праляцеў.
Позні час. Паўночны час.

У завейную гэту ноч
Не кладзе спаць стома нас.
Мы не стульваем зморана воч
Мы чакаем – "У апошні час".

Мабыць, з намі Каўказ і Сучан,
Уся краіна гадае не раз:
Што сягоння – Батайск, Лісічанск?
Позні час. "У апошні час"...

Нібы чуцен агонь і дым,
Кулямётныя чэргі гучаць...
Колькі тысяч з чужынскай арды
Свой зазнала апошні час?

Хутка зводка. Завершыўся дзень.
Свет замоўк. Свет глядзіць на нас.
Чуеш, брат, перамога ідзе!
"У апошні час".
Пераможны час!

1942-43 гг.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА
© БДАМЛМ

Мележ І.П. "Радзіма", "У апошні час". Вершы. Машынапіс з аўтарскай праўкай. 1938-1943 гг.



Чырвоная змена, 21 ліпеня, 1945

Іван МЕЛЕЖ

Тварам да твару

©БДАМЛМ

Мележ І.П. "Хто прыйшоў уночы" = "Тварам да твару". П'еса ў адной дзеі. Варыянт. Выразка з газеты "Чырвоная змена" з аўтарскай праўкай. 21 ліпеня 1945 г.



І.П.Мележ з акцёрамі тэатра імя Я.Купалы пасля спектакля “Людзі на балоце”. 1966 г.

І.П. Мележ. [1941 г.]





Дорогой тов. Мележ Иван! 57
Прочитав вашу книгу На болоте
я вспомнил свое детство я как
раз вырос т.е. родился и до
дет-дома рос как раз в такой
глуши о которой вы пишете
даже могу дать адрес где я
вырос Палесская обл. Глуский р-н
дер. Зеленковичи. дорогой мой
писатель теперь ваша книга
стала мне настольной, ибо
прочитав ее однажды я, как будто
вернулся в прошлое, в детство
Ваша книга написана справед-
ливо, это не роман, это горькая
правда о моем многострадальном
народе Белоруссии. Спасибо родной
дай тебе „бог" всего наилучшего
в твоих успехах в личной, литератур..
и вообще во всех фазах жизни.
См. на об.

Писателю Ивану Павловичу 65
Мележу
от читателя романа
„Дыхание грозы".
С большим интересом прочитал
Ваш ~~книгу~~ роман „Дыхание грозы" и
глубоко признателен автору и
редакции „Роман-газеты" за издание
этой вполне реалистической по
содержанию и художественной по
форме книги. Из вышедшей лите-
ратуры на темы коллективизации
крестьянских хозяйств, кроме „Подня-
той целины" Шолохова, как будто
не было такой книги, конкретно
и правдиво описывающей смутное
время в деревнях в период „сплош-
ной коллективизации". Самар-
ская губерния далеко отстоит
от Белоруссии, но в основном
и у нас происходило все также,
как и у нас, но темпы ее, пожалуй,
были более быстрые – в течении
нескольких месяцев. Впрочем в
„Дыхании грозы" описывается
только начало коллективизации
и в дальнейшем [illegible]
[illegible] ее темпы в 1933 [illegible]
ли и у нас [illegible]
призыву [illegible]
[illegible] хороших [illegible]
люди не разбегались [illegible]
хотя она и высказана вполне
Ленинскую мысль [illegible] лучше

Пісьмы чытачоў пра раманы І.П.Мележа “Людзі на балоце” і “Подых навальніцы”. 1966-1969 гг.




Мележ І.П. “Мінскі напрамак”. Раман. Кніга другая. “Мінск за небакраем”. Перапрацаваны варыянт. Друкаванае выданне з праўкамі аўтара. 1958 г.



Пісьмы чытачоў пра раман І.П.Мележа “Мінскі напрамак”. 1955-1956 гг.



Сцэны са спектакля тэатра імя Я.Купалы “Людзі на балоце” (рэж. Б.У.Эрын, З.І.Браварская, Г.І.Уладамірская). Г.М.Гарбук у ролі Васіля, Л.М.Давідовіч у ролі Ганны, М.М.Яроменка ў ролі Міканора. 1966 г.

# Літаратурная спадчына І. П. Мележа

Мележ, І. П. Подых навальніцы : другі раман з цыкла "Палескай хронікі" / Іван Паўлавіч Мележ. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. — (Бібліятэка школьніка).

*Чытач знаёміцца з другой часткай "Палескай хронікі" Івана Мележа, дзе сустрэнецца са знаёмымі героямі — Васілём Дзятлам, Ганнай Чарнушкай, Халімонам і Яўхімам Глушакамі, "бальшавіком з чалавечым тварам" Апейкам. З'яўляюцца і новыя — зацяты калектывізатар Башлыкоў, паэт Алесь Маёвы. Пісьменнік працягвае разгортваць апавядальную плынь, якую можна назваць сагай пра Палессе і параўнаць з творамі Галсуорсі, Фолкнера, Гарсія Маркеса, якія ад рэгіянальнага ішлі да ўніверсальнага. Цэнтрам створанага Мележам свету па-ранейшаму застаюцца Курані, дзе хаты стаялі на востраве, дзе кахаліся Васіль і Ганна. І...працягваюць кахаць, нягледзячы ні на што — ні на Глушакоў, ні на вясковую мараль, ні на калектывізацыю. Але не пакідае Васіля мара пра зямлю запаветную, тую, што каля цагельні...*

Мележ, І. П. Белыя вішні і яблыні : апавяданні і аповесці / І. П. Мележ. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1976. — 479 с., [1] л. партр. — (Бібліятэка беларускай прозы).

*У кнігу "Белыя вішні і яблыні" ўвайшлі апавяданні і аповесці пісьменніка, напісаныя за многія гады творчай дзейнасці. Тут і творы пра вайну — "Ноччу", "У завіруху", "Такі кароткі водпуск", і творы аб пасляваенным жыцці народа — "Гарачы жнівень", "Дом пад сонцам", "Блізкае і няблізкае". Асобнае месца займае дакументальная аповесць пра двойчы Героя Савецкага Саюза С. Ф. Шутава "Дарогі на Ўсход і на Захад". Упершыню ў кнізе друкуюцца лірычна-філасофскія эцюды — "Трэба глядзець на сосны", "Хочацца падужацца", "Белыя вішні і яблыні".*

Мележ, І. Гарачы жнівень : апавяданні / Іван Мележ. — Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1948. — 104 с.

*Адна з першых надрукаванных кніг Івана Мележа уключае наступныя апавяданні: "Гарачы жнівень", "Перад навальніцай«,"У адной сям'і«,"Павел прыехаў«,"Незнаёмы бацька«,"Таварышы«."Гарачы жнівень" – першая спроба Мележа паказаць звычайнае працоўнае жыццё ў мірны час. Многія апавяданні са зборніка 1948 г. вяртаюць нас у дзяцінства аўтара, сярод лепшых з іх можна назваць "Перад навальніцай" (1947) і "Павел прыехаў" (1947).*

Мележ, І. П. Жыццёвыя клопаты : артыкулы, эсэ, інтэрв'ю / І. П. Мележ. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1975. — 591 с.

*У гэтай кнізе надрукаваны розныя творы па зместу, па жанравых асаблівасцях, па памеру. Разнастайныя і пытанні, якія ўздымаеаў у кнізе. Сабраныя разам творы па сутнасці становяцца своеасаблівым дзённікам і пэўным чынам справаздачай пісьменніка перад чытачом.Творы падаюцца ў храналагічным парадку. Такім чынам, лепш захаваецца непасрэднасць жывога жыцця.Першы з твораў, якія ўвайшлі ў кнігу, быў напісаны ў 1947 годзе, апошні — у 1973-м.*

Мележ, І. П. Людзі на балоце : першы раман з цыкла "Палескай хронікі" / Іван Паўлавіч Мележ. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. — (Бібліятэка школьніка).

*У творы распавядаецца аб усталяванні савецкай улады ў звычайнай беларускай вёсцы Курані, пра жыхароў глухой вёсачкі, якая адрэзаная ад астатняга свету непраходнымі палескімі балотамі. Аўтар амаль з этнаграфічнай дакладнасцю апісаў жыццё і побыт беларускага насельніцтва, традыцыі, паданні, святы, скокі з песнямі і многае іншае.*

Мележ, І. Выбраныя творы / Іван Мележ ; [прад. і камент. С. Андраюка]. – Мінск : Беллітфонд, 2001. – 576 с. : іл. – (Беларускі кнігазбор: мастацкая літаратура).

У аднатомнік народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа ўключаны выдатнейшы раман «Людзі на балоце», першы з цыклу «Палеская хроніка», лепшыя апавяданні, старонкі з «Дзённіка» і з «Запісных кніжак», а таксама шэраг літаратурна-публіцыстычных артыкулаў і лістоў, у якіх найбольш дакладна выяўлена эстэтычная пазіцыя пісьменніка Гэта — семнаццатая кніга серыі «Беларускі кнігазбор».

Мележ, І. П. Збор твораў : у 10 т. / І. П. Мележ ; рэдакцыйная калегія: А. М. Адамовіч [і інш]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1979—1985.

*Літаратурная спадчына лаўрэата Ленінскай прэміі, народнага пісьменніка Беларусі Івана Паўлавіча Мележа (1921–1976) стала нашым нацыянальным гонарам. Гэты дзесяцітомны Збор яго твораў уключае ў сябе ўсё лепшае, што створана пісьменнікам.*

Мележ, І. П. Мінскі напрамак : раман у 2 т. / Іван Мележ. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1974.
*"Хмары на світанні" — першая кніга рамана "Мінскі напрамак" лаўрэата Ленінскай прэміі, народнага пісьменніка Беларусі І. Мележа. Аўтар, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, выкарыстаўшы асабістыя ўспаміны і ўспаміны многіх удзельнікаў баёў, вывучыўшы гістарычныя матэрыялы, з вялікім майстэрствам і глыбінёю расказвае аб падзеях 1944 года, якія папярэднічалі вызваленню Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў."Мінск за небакраем" і "Будучыня з намі" — другая і трэцяя кнігі рамана "Мінскі напрамак". Падзеі, апісаныя ў гэтых кнігах, ахопліваюць час, калі воіны Савецкай Арміі і беларускія партызаны, праяўляючы незвычайны масавы гераізм, мужнасць, разграмілі летам 1944 года нямецка-фашысцкія войскі і канчаткова вызвалілі родную Беларусь.*

Мележ, І. Блізкае і далёкае : апавяданні / Іван Мележ. — Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1954. — 214 с.
*Кніга класіка беларускай літаратуры Івана Паўлавіча Мележа складаецца з апавяданняў і аповесцяў розных гадоў.*

Мележ, І. П. Завеі, снежань : трэцці раман з цыкла "Палескай хронікі" / Іван Паўлавіч Мележ. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. — 262 с. — (Бібліятэка школьніка).
*Многія пісьменнікі і даследчыкі не раз падкрэслівалі значнасць, непаўторнасць і самабытнасць кожнага з раманаў "Палескай хронікі". Некаторыя з іх звярталі ўвагу на моўнае багацце твораў І. Мележа. Так, В. Вітка адзначыў багатую, жывую мову твора, падкрэсліўшы, што ў ёй няма фальшу, яна гучыць натуральна, свежа, па-народнаму ярка, а Т. Хадкевіч назваў мову твораў надзвычай сакавітай, жывой, каларытнай. У апошнім з "Палескай хронікі" рамане "Завеі, снежань", хоць дзеянне адбываецца на Палессі, у цэнтры твора людзі гарадскія, камуністы, адданыя партыі, як Башлыкоў. Вакол іх разгортваюцца падзеі, паказваецца іх унутраны склад.*

Мележ, І. Пакуль вы маладыя : п'еса ў 3 дзеях, 6 карцінах / Іван Мележ. — Мінск : Беларусь, 1958. — 74 с.

*"Пакуль вы маладыя" (1955), першая поўнаметражная п'еса аўтара, уздымае цэлы шэраг маральных і этычных праблем, што паўсталі ў першыя дні сумеснай работы перад маладымі інжынерамі, якія дасюль вучыліся разам. Мы бачым, як яны абіраюць розныя шляхі ў жыцці, прытым што сам пісьменнік яўна задае п'есе павучальны, маралізатарскі тон.*

Мележ, І. П. Выбраныя творы / І. П. Мележ ; [укладанне, прадмова і каментарыі С. Андраюка]. — Мінск : Беллітфонд, 2001. — 571 с., [4] л. іл. — (Беларускі кнігазбор).

*У аднатомнік народнага пісьменніка Беларусі Івана Мележа ўключаны выдатнейшы раман "Людзі на балоце", першы з цыклу "Палеская хроніка", лепшыя апавяданні, старонкі з "Дзённіка" і з "Запісных кніжак", а таксама шэраг літаратурна-публіцыстычных артыкулаў і лістоў, у якіх найбольш дакладна выяўлена эстэтычная пазіцыя пісьменніка.*

Мележ, І. У гарах дажджы : апавяданні / Іван Мележ. — Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1957. — 222 с.

*У зборнік увайшлі апавяданні і аповесці Івана Мележа 1950-х гадоў. Першае з іх, што дало назву зборніку, напісана на матэрыяле даваеннай службы аўтара ў войску.*

Мележ, І. Пакуль вы маладыя : п'еса ў 3 дзеях, 6 карцінах / Іван Мележ. — Мінск : Беларусь, 1958. — 74 с.

*"Пакуль вы маладыя" (1955), першая поўнаметражная п'еса аўтара, уздымае цэлы шэраг маральных і этычных праблем, што паўсталі ў першыя дні сумеснай работы перад маладымі інжынерамі, якія дасюль вучыліся разам. Мы бачым, як яны абіраюць розныя шляхі ў жыцці, прытым што сам пісьменнік яўна задае п'есе павучальны, маралізатарскі тон.*

Мележ, І. У завіруху : апавяданні / Іван Мележ. — Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1946. — 63 с.

*Зборнік уключае наступныя апавяданні: "Васіль Дзянісавіч", "Сустрэча", "Канец размовы", "Праз год", "У завіруху", "Пабыўка сержанта«.Адным з найлепшых твораў першага празаічнага зборніка Івана Мележа было апавяданне "У завіруху", якое дала назву ўсёй кнізе. Заснаванае на ўласным досведзе аўтара, яно апісвае жудаснае падарожжа маладога салдата Засмужца, які атрымаў заданне ў лютую завіруху даставіць пакет ад галоўнакамандуючага камандзіру кавалерыйскай брыгады. Апавяданне ў яркіх фарбах малюе боль і зняможанне, якія салдат перамагае толькі таму, што ўсведамляе важнасць задання. Чытачу перадаецца пачуццё бязмежнай стомленасць і слабасць героя, але як толькі ён трохі ўзнаўляе свае сілы, то атрымлівае іншае заданне, што падаецца проста невыканальным, і салдат спрабуе ўхіліцца, аднак чалавек, які павінен ісці замест яго,*

Мележ, І. Хто прыйшоў уночы : п'еса ў адной дзеі / Іван Мележ. — Мінск : Беларусь, 1966. — 26 с. — (У рэпертуар мастацкай самадзейнасці).

*Аднаактовая п'еса "Хто прыйшоў уночы" аднаўляе адзін з эпізодаў Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі. Гераічная барацьба народа з нямецка-фашысцкімі акупантамі, са здраднікамі-паліцаямі, розум, вынаходніцтвы, ваенныя хітрыкі партызан — вось што з'явілася зместам п'есы.*